Created in Master PDF Editor - Demo Version

Министерство образования Республики Беларусь

Учреждение образования
«Белорусский государственный педагогический университет
имени Максима Танка»

Исторический факультет

# АКТУАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ СОЦИАЛЬНО-ГУМАНИТАРНОГО ЗНАНИЯ

Материалы III Международной студенческой
научно-теоретической конференции

Минск, 18 апреля 2018 г.

Минск
РИВШ
2018

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

УДК 378.14:30(061.3)
ББК 74.58:60
А43

Рекомендовано
советом исторического факультета
УО «Белорусский государственный педагогический
университет имени Максима Танка»
(протокол № 8 от 29 марта 2018 г.)

Редакционная коллегия:
кандидат исторических наук доцент *А. В. Касович* (отв. ред.);
кандидат исторических наук доцент *С. П. Шупляк*;
кандидат педагогических наук доцент *А. А. Корзюк*;
кандидат исторических наук доцент *А. Ф. Великий*

Рецензенты:
доктор исторических наук профессор *А. М. Лютый*;
доктор исторических наук профессор *И. В. Варивончик*

**Актуальные** проблемы социально-гуманитарного знани
А43 материалы III Междунар. студ. науч.-теорет. конф., Ми
18 апр. 2018 г. / редкол.: А. В. Касович (отв. ред.) [и д
Белорус. гос. пед. ун-т им. М. Танка. – Минск : РИВШ, 2018
246 с.
ISBN 978-985-586-129-5.

В сборнике представлены материалы исследований молодых уче
высших учебных заведений Республики Беларусь и Российской Феде
ции, учащихся учреждений общего среднего образования, посвящен
актуальным проблемам исторических, педагогических и социально-гума
тарных научных дисциплин.
Адресуется преподавателям, магистрантам и студентам вузов.

**УДК 378.14:30(06**
**ББК 74.58**

**ISBN 978-985-586-129-5**

© Оформление. ГУО «Республиканс
институт высшей школы», 2018

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

# СПРОБА ПСІХААНАЛІЗУ АСОБЫ СТАНІСЛАВА АЎГУСТА ПАНЯТОЎСКАГА

*Н.І. Васілюк, 2 курс, факультэт гісторыі, камунікацыі і турызму, ГрДУ, Гродна*
*навук. кір. – С.В. Марозава, док.гіст. навук, праф., ГрДУ*

Псіхагісторыя - гэта навука, якая вывучае псіхалагічную матывацыю дзеянняў людзей у мінулым. Па словах Лойда дэ Моза, яе заснавальніка, псіхагісторыя вывучае гістарычную матывацыю і ставіць перад сабой мэту тлумачэння дзеянняў індывідаў у гістарычных групах.

Асоба Станіслава Аўгуста Панятоўскага - апошняга караля польскага і вялікага князя літоўскага - выклікае шмат спрэчак. На погляд адных, напрыклад, савецкага гісторыка Яўгена Тарле, Панятоўскі быў сапраўдным каралем, які рабіў усе магчымае дзеля незалежнасці краіны. Іншыя ж, такія, як Н.І. Кастамараў і В.А. Ключэўскі, лічаць Станіслава Аўгуста здраднікам, які дапусціў падзел Рэчы Паспалітай, амаль нічога не зрабіўшы дзеля яе захавання. Дык хто з іх праў? Кім насамрэч з'яўляўся Станіслаў Аўгуст і чаго хацеў? Многія абвінавачваюць яго у слабахарактарнасці. Я гэтага не адмаўляю, але стаўлю наступнае пытанне: адкуль бярэ вытокі слабасць яго характару? Што на самай справе не давала яму заўзята адстойваць сваю пазіцыю і, магчыма, захаваць Рэч Паспалітую?Пастараемся даць адказ на гэтыя пытанні шляхам псіхааналізу асобы апошняга караля Рэчы Паспалітай..

Прычыны таго, што Станіслаў Аўгуст меў слабы характар, варта шукаць у яго дзяцінстве. Звярнуўшыся да працы Леаніда Несцярчука, прысвечанай жыццю Панятоўскага, можна знайсці цікавыя рэчы. Калі гісторык, карыстаючыся крыніцамі, апісвае дзяцінства будучага караля, адносіны з маці, ён распавядае наступнае: "Канстанцыя была суровай жанчынай. Сыны былі ёй адданыя і вельмі прывязаныя да яе. Быўшы фанабэрыстай, запальчывай, яна атрымала мянушку навальнічнай хмары"[2, с. 14].

Зыходзячы з гэтага, можна зрабіць высновы. Станіславу з дзяцінства не давалі самастойнасці. Ен паступаў толькі так, як загадвала яму маці, пачынаючы сур'езнымі рашэннямі і заканчваючы дазваленнем наконт таго, з кім яму можна гуляць, размаўляць, а з кім нельга. Магчыма, з гэтага і зыходзіць яго няўменне выказваць свае погляды і падатлівасць чужому ўплыву. Гэтыя рысы валодалі Панятоўскім усё жыццё.

Калі звярнуцца да псіхалогіі, можна канстатаваць цікавы факт: выбіраючы сабе спадарожніцу па жыцці, мужчына жадае знайсці падобную да сваей маці, таму што менавіта яна давала яму, яшчэ хлопчыку, столькі любові, цеплыні і пяшчоты. Пасталеўшы, мужчына памятае гэта і не хоча губляць, таму стараецца выбраць жанчыну, якая давала б яму не менш любові і пяшчоты. Кожны мужчына гэтага жадае. Дык, можа, таму Станіслаў Аўгуст і закахаўся ў Кацярыну? Яна была такой жа упэўненай, моцнай жанчынай, як яго маці. Панятоўскі прывык, што ім кіруюць, апякаюць, клапоцяцца, і таму шукаў жанчыну, якая стала б для яго другой мамай. Ужо пасля першых сустрэч з Кацярынай Станіслаў заўважыў яе моцны характар і пісаў у сваіх мемуарах наступнае: "Она многое знала. Она умела приветить, но и нащупать слабое место собеседника. Уже тогда, завоевывая всеобщую любовь, она торила себе дорогу к трону"… [3]

Кацярына жа, у сваю чаргу, разумела характар Станіслава і выкарыстоўвала яго слабасць ў сваіх мэтах. Ведаючы, наколькі славалюбным быў Станіслаў Аўгуст, яна наўмысна раскрывала у ім добрыя рысы, узвышала яго як асобу. Ці мог Панятоўскі адысці ад такой жанчыны?

Да каранацыі ен казаў сваёй каханцы:" Навошта рабіць мяне каралём? Як вы не можаце зразумець, што я хацеў бы толькі бачыць ваш прыгожы твар на сваей падушцы?"[3]

Яшчэ у 1764 годзе за Панятоўскага ўсё вырашылі, Кацярыне было выгадна бачаць свайго стаўленніка на троне Рэчы Паспалітай, вось яна і адправіла яго туды. А малады, усім сэрцам закаханы Станіслаў да апошняга марыў быць побач з каханай. Ён ужо пакляўся перад духоўнікам ні з кім ніколі не жаніцца, акрамя Кацярыны. Канешне, у такім выпадку у першую чаргувартадумацьпракраіну, пралюдзей, алеклапаціўсяСтаніслаўзусім праіншае. А калі ўлічыць яшчэ і тое, што Станіслаў Аўгуст быў вельмі славалюбным чалавекам, дык усё становіцца на свае месцы. З дапамогай Расіі яму прапанавалі славу і каханку, чаго яшчэ можна хацець?

Ішоў час. Панятоўскі сталеў і пачынаў лепш разумець сітуацыю, ў якой апынуўся ён і яго народ. Малады кароль ведаў, што трэба прымаць меры, пакуль яшчэ не позна. І вось ён пачынае праводзіць рэформы: відазмяняе армію, жадае адмяніць ліберум вета, а ў 1791 г. падпісвае канстытуцыю, якая зрабіла б Рэч Паспалітую моцнай і незалежнай. Але ў адказ кароль сустракае жорсткае супраціўленне спачатку з боку недавольнай шляхты, на паўнамоцтвы якой пасягнулі, жадаючы скасаваць ліберум вета, а затым і Кацярыны Другой, якая не магла дапусціць узвышэння



Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

краіны свайго фаварыта. Нават народ ставіўся да Панятоўскага як да здрадніка, называючы яго "саламяным каралем".Панятоўскі бачыў, што супраць яго выступілі амаль ўсе: і шляхта, і Кацярына, і народ. Уже тады ен адчуў сваю слабасць, таму і Канстытуцыю адмяніў, перастаўшы верыць у яе сілу, і паўстанцаў 1794 годзе не падтрымаў.

І вось надыходзіць 1793 год - год другога падзелу Рэчы Паспалітай, трактатаб якім быў падпісаны ў Гродне. На сейме кароль трымаўся ўпэўнена. Гродзенскі сейм сам Панятоўскі характарызаваў як пекла і яго паплечнікі падкрэслівалі, што кароль выглядаў вельмі дрэнна і на вачах старэў. "Он плакал, доходя почти до безумия. Несчастный король не знал, кого держаться, и склонялся то к одной, то к другой партии [1, с. 56] Король Станислав-Август в речи своей 20 июня объявил сейму, что он приступил к Тарговицкой конфедерации под условием неприкосновенности польских владений, что он никоим образом не будет содействовать уступке польских провинций в надежде, что и сейм будет поступать точно так же" [4].

Але усе-такі падзел адбыўся. Спачатку ён рабіў усё магчымае, каб захаваць дзяржаву, кажучы наступныя словы: "Пусть стреляют...Пусть в Сібірь высылают, но государства не здадім", а потым згаджаўся з ворагамі, думаўшы толькі аб адным пытанні: ці аплацяць ва ўзнагароду за яго пакорлівасць дзяржавы, разабраўшыя па частках яго краіну, яго даўгі і забяспечаць яму магчымасць спакойна апошнія гады?

У верасні 1795 года Рэч Паспалітая ўвайшла ў склад Расійскай імперыі і знікла з палітычнай карты Еўропы назаўседы.

Дык вінаваты апошні кароль польскі і вялікі князь літоўскі у развале Рэчы Паспалітай? Несумненна, на ім ляжыць значная частка віны. Калі Станіслаў Аўгуст яшчэ тады, у 1764 годзе разумеў, што карона яму зацяжкая, навошта апранаў яе? У час, калі прымаў канстытуцыю, навошта потым адхіліўся ад яе? Чаму на сейме ен павеў сябе так неаднабакова?

Гэтыя паводзіны кідаюць сапраўдны цень на яго праўленне, але нішто не перашкаджае нам паглядзець на гэтую сітуацыю з іншага боку, зразумеўшы тое, штозначную ролю ў з'явах, якія адбыліся, адыграла слабахарактарнасць караля. Гэтым надзяліла яго прырода, а можна вінаваціць чалавека ў тым, што ад яго не залежыць? Каханка (больш магутная за яго) яго пасадзіла на трон, яна ж яго адтуль і скінула.

Так і ёсць. Больш моцныя асобы кіравалі Станіславам дзеля сваёй жа выгады. Кароль гэта разумеў, але нічога не мог зрабіць, у сувязі з чым і мучыўся. Толькі ўявіце, што адчуваў гэты чалавек, калі ім кіравалі, як хацелі, ставілі ў невыносныя ўмовы і не пакідалі яму права выбару. Станіслаў Аўгуст пытаўся ў Кацярыны, навошта яна спачатку дала яму карону, а потым забірае, але адказу так і не дачакаўся. Як казаў Я. П. Карновіч, Рэч Паспалітая мела патрэбу ў караля-змагары, але Панятоўскі не быў народжаны воінам.

*Літаратура*

1.В. І. Вадавозаў «Очерки из русской истории XVIII в. » (1904 г.)

2.Несцярчук Л. М. «Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. Манарх, асветнік, мецэнат». Брэст. Брэсцкая друкарня, 2011. -298 с.

3.Станислав - Август Понятовский (1732 – 1798) МЕМУАРЫ //http://elcocheingles.com/Memories/Texts/Poniatovsky/Poniatovsky.htm. Дата заходу 20. 03. 2014.

4.Я. Е. СИВЕРС И ГРОДНЕНСКИЙ СЕЙМ. -[Электронны рэсурс]-Рэжым доступу:http://www. vostlit. info/Texts/Dokumenty/Polen/XVIII/1760-1780/Stegniy/framepred36. htm. -Дата доступу: 25. 04. 2017

## ИКОНОСТАС СВЯТО-НИКОЛЬСКОЙ ЦЕРКВИ В ГОРОДЕ МОГИЛЁВЕ

*Я.П. Волкова, 3 курс, историко-филологический факультет, МГУ имени А.А.Кулешова, Могилёв*
*науч. рук. – Ю.В. Аленькова, канд. культурологии, доц., МГУ имени А.А.Кулешова*

Церковь Святого Николая Свято-Никольского монастыря в Могилёве – один из уникальных уцелевших памятников могилёвской школы барокко XVII-XVIII веков. Она знаменита не только своими архитектурными формами, но и своим внутренним убранством, особенно резным иконостасом, который можно считать величайшим памятником как декоративно-прикладного искусства, как и станковой живописи. Этот иконостас сегодня реконструирован.



Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version